БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА: ШЛЯХ ПРАЗ СТАГОДДЗІ

Адбіткі мінулага пакідаюць свой след у памяці зусім непадуладна нашым жаданням ці памкненням. На падкорку мозга можа запісацца нешта, здавалася б, абсалютна не галоўнае, другаснае, але ўспамін таго, што адбылося, адгэтуль будзе вызначацца менавіта тым вобразам. Напрыклад, для мяне Белавежская пушча, у якую я ўпершыню трапіў гадоў трыццаць пяць таму, яшчэ зусім дзіцём, запомнілася не велічнымі дрэвамі, не казачным водарам некранутага бору і нават не ляснымі звярамі, якіх мы там-сям сустракалі, – вопытны праваднік-ляснічы ведаў, дзе і што гасцям паказаць. І нават не зубрамі, якіх маці, трымаючы мяне на руках, вырашыла пагладзіць – глядзі, маўляў, сынок, якія кароўкі (за што атрымала ад лесніка порцыю кароткіх і не зусім літаратурных, але надта ж ёмкіх выразаў). А запомнілася пушча чамусьці гіпсавымі белымі аленямі, якія быццам бы выходзяць з лесу абапал дарогі, вітаючы гасцей Белавежы. Вось і цяпер, накіроўваючыся ў пушчу, сустрэў непадалёку Камянюкаў гэтых аленяў – і пацяплела на душы: прыехаў. Прывітанне, юбілярка!



СВЕДКІ РОЗНЫХ ЭПОХ

Найперш удакладнім: толькі што адзначылі мы не юбілей самой Белавежскай пушчы, а шасцісотыя ўгодкі ўстанаўлення тут спецыяльнага рэжыму аховы жывёл праз абмежаванні на паляванне.

Справа ў тым, што вызначыць узрост пушчы практычна немагчыма. Ды і ці так гэта важна – ведаць, колькі гадоў расце на гэтым месцы лес? Вядома, напрыклад, што ў V стагоддзі да нашай эры пра гушчар у той частцы Еўропы, дзе сёння шуміць Белавежа, пісаў Герадот. А пазней гэтыя ж лясы ўзгадвалі Пліній і Тацыт. Потым, ужо ў 983 годзе, непразлазны гушчар на месцы сённяшняй пушчы ўзгадваецца ў Іпацьеўскім летапісе. З пісьмовых жа крыніц сёння ведаем, што менавіта ў гэтых мясцінах любілі ладзіць паляванне і Уладзімір Манамах, і легендарныя ўладары Вялікага княства Літоўскага Трайдзень і Гедымін.

Словам, лес рос тут спрадвеку, заўсёды. І менавіта гэтай акалічнасцю, як лічаць вучоныя, пушча і каштоўная. Як падкрэсліў генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Міхаіл Нікіфараў, і сённяшняя Белавежская пушча – лес старажытны. Не так важна, што сярэдні ўзрост дрэваў – сто гадоў, хоць трапляюцца і сапраўды ўнікальныя экзэмпляры, сведкі многіх-многіх стагоддзяў. Дубу-патрыярху, напрыклад, паводле ацэнак спецыялістаў, не менш як шэсцьсот гадоў. Больш важна тое, што адны расліны прыходзілі на змену іншым, старыя дрэвы саступалі месца пад сонцам маладзейшым, але ўнікальная экасістэма захоўвалася стагоддзямі. «І ў выніку Белавежская пушча – гэта эталон лясоў, якія раслі некалі на тэрыторыі ўсёй Еўропы, – лічыць Міхаіл Нікіфараў. – У гэтым значэнне пушчы. Гэта апошні астравок еўрапейскага лесу, які на сваім вяку зведаў змяненні ў найменшай ступені».

А юбілей... У снежні 1409 года пушча ці не першай у свеце (калі не браць да ўвагі забарону чужынцам паляваць у прыватных магнацкіх лясах) атрымала запаведны статус.

Між іншым, як сведчаць навукоўцы, менавіта тады ў польскіх і велікакняжацкіх дакументах пушча пачала называцца Белавежскай.

Спрэчкі пра паходжанне гэтай назвы працягваюцца дагэтуль. Відавочная, на пер-

шы погляд, прывязка наймення да Белай Вежы, якая ўзвышаецца на беразе ракі Лясная ў суседнім старажытным Камянцы, аказваецца памылковай. Па-першае, камянецкі данжон (так называюць абарончыя збудаванні такога тыпу) сталі называць Белым толькі ў XIX стагоддзі – краязнаўцы чамусьці палічылі, што вежу некалі бялілі. Рэха гэтай памылкі адгукнулася вежы ў 60-я гады мінулага стагоддзя – камянецкі слуп з лёгкай рукі нейкага чыноўніка сапраўды выпацкалі пабелкай (дзякуй Богу, сёння бакі вежы зноў набылі свой натуральны выгляд – кладкі з чырвонай цэглы). Па-другое, і вежай збудаванне ў Камянцы нараклі значна пазней, чым узнікла імя пушчы. Словам, камянецкі слуп да пушчы асаблівых адносін не мае.

Паводле іншай версіі, у гарадку Белавежа, які сёння знаходзіцца на польскім баку, некалі існаваў паляўнічы палац з белымі вежамі, ад чаго і магла пайсці назва пушчы. Ёсць яшчэ меркаванне, быццам пушча магла атрымаць сваё імя ад племя белых яцвягаў, якія былі спрадвечнымі насельнікамі гэтай тэрыторыі. І, маўляў, з цягам часу «Белаяцвяжская» пушча стала «Белавежскай».

Нарэшце, некаторыя філолагі звязваюць назву пушчы са славянскім словам «весь», якое дагэтуль выкарыстоўваюць палякі, – адсюль і беларускае «вёска», і нават літоўскае «вешу».

Ды зрэшты, хай гісторыкі з філолагамі спрачаюцца і надалей, прызванне ў іх такое, а мы тым часам адзначым: адкуль бы ні паходзіла назва, значнасць пушчы, асабліва ў эканамічным плане, разумелі ўсе, хто ў розныя часы валодаў гэтай зямлёй. А таму і захоўвалі тут запаведны рэжым, абаранялі лес і ад несанкцыянаваных высечак, і ад недазволенага палявання.

Так, у 1538 годзе кароль Жыгімонт I падпісаў закон аб ахове лясоў і звяроў пушчы. У 1557 годзе быў створаны першы Лясны статут пушчы. З гэтага часу, лічаць гісторыкі, пачалося прамысловае асваенне багацця́ў старажытнага лесу. У 1640 годзе кароль Уладзіслаў IV забараніў секчы тут жывыя дрэвы, а ў 1802 годзе – ужо цар Аляксандр I сваім указам увёў забарону паляваць у пушчы на зубра. У 1864 годзе тут пачалі аднаўляць папуляцыю высакароднага аленя, якога перад тым, атрымліваецца, здолелі паспяхова вынішчыць...

І тым не менш ёсць прынцыповы момант, не ўспомніць пра які ў кантэксце юбілею запаведнага рэжыму было б недаравальным. Так, і каралі з князямі, і цары з генеральнымі сакратарамі, аддаючы загады аб ахове пушчы ад чужынцаў, самі сабе дазвалялі рабіць у запаведным лесе ўсё што заўгодна. Дакладна вядома, што ў 1839 годзе, напрыклад, для карабельных майстроў рускага флоту ў пушчы былі звалены і вывезены 2834 дубы-волаты. Відавочна, знішчаным дрэвам было не менш як па 350–400 гадоў, і пры гэтым яны былі абсалютна здаровыя – паводле тэхналагічных патрабаванняў, ствалы такіх дубоў не маглі мець ні гнілых сукоў, ні наростаў па ўсёй сваёй даўжыні.

З 1845 па 1848 год у Белавежы было высечана 13 тысяч першакласных соснаў толькі для аднаго гандлёвага дома «Томпсан і Бонар», пра што з абурэннем пісала газета «Колокол».

Люта, па-драпежніцку накінуліся на пушчу немцы, якія акупіравалі гэтую зямлю пад час Першай сусветнай вайны. Крыніцы сведчаць, што акупанты пабудавалі ў лесе чатыры лесапільныя заводы, праклалі 300 кіламетраў вузкакалейнай чыгункі. За два гады панавання нямецкія «акуратысты» вывезлі ў Германію 4,5 млн. кубаметраў драўніны!

Між іншым, калі ў 1941 годзе немцы, гэтым разам ужо ў гітлераўскай форме, зноў вярнуліся ў Белавежскі лес, сітуацыя, на шчасце, не паўтарылася – пушчу выратаваў... Герынг. Паплечнік фюрэра, які проста млеў ад палявання, пабываў у пушчы ў 1939 годзе і быў настолькі ёй зачараваны, што, захапіўшы запаведны лес, загадаў стварыць тут узорную паляўнічую гаспадарку рэйха. Мясцовыя старажылы дагэтуль расказваюць, што лес у ліхалецце



Дочкі імператара Мікалая II збіраюць ягады ў Белавежскай пушчы, восень 1913 года

вартаваўся так старанна і так пільна, што ў Белавежскай пушчы за ўсю вайну не было нікога – ні браканьераў, ні партызан.

А пасля вайны, як толькі аціхлі ў гэтых мясцінах апошнія баі (калі больш дакладна, то 28 ліпеня 1944 года), запаведнік зноў пачаў працаваць. Аднавілася і карпатлівая навуковая дзейнасць, распачалася ў тым ліку і знакамітая на ўвесь свет паспяховая і прыгожая акцыя па аднаўленні папуляцыі белавежскага зубра. Звера, які разам з буслам стаў неафіцыйным сімвалам Беларусі – сімвалам яе моцы, велічы, няскоранасці і невынішчальнасці...



Кальцаванне дзікоў у Белавежскай пушчы. 1950-я гады

Аднак было б несумленна не ўспомніць, што ў 1957 годзе запаведнік змяніў статус – Белавежская пушча пачала называцца дзяржаўнай запаведна-паляўнічай гаспадаркай. Мікіта Сяргеевіч, аказваецца, быў не менш заядлым паляўнічым, чым Герынг. Потым Хрушчова змяніў Брэжнеў, які таксама любіў пахадзіць па лесе са стрэльбай. Шчыра падзяляла захапленне генсека безліч больш дробных савецка-партыйных і вайсковых дзеячаў. Карацей, калі для народа Белавежская пушча сапраўды была запаведнай зямлёй, для таварышаў, не абдзеленых уладай, гэты лес стаўся месцам рэгулярнага палявання. Дзякуй Богу, не на зброю...

Вось і атрымліваецца, што сапраўды запаведнага рэжыму (строгага і без выключэнняў) старажытная пушча зазнала на сваім вяку не так і многа, бадай, нават менш як два дзесяцігоддзі, прыблізна з таго часу, як Беларусь атрымала незалежнасць. Што ні кажы, а Аляксандр Лукашэнка стаў першым кіраўніком краіны, які ў гэты лес заходзіць без стрэльбы і без мары здабыць паляўнічы трафей. І такога ж стаўлення да найвялікшага прыроднага скарбу Беларусі, якім, без сумнення, з'яўляецца Белавежская пушча, Прэзідэнт, як мы гэта чарговы раз пачулі пад час юбілейных мерапрыемстваў, патрабуе ад сваіх падначаленых.

ВЫСОКІ СТАТУС НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПАРКУ

Афіцыйная назва запаведніка сёння – дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «Белавежская пушча». Месціцца запаведны лес на тэрыторыі трох раёнаў – Камянецкага і Пружанскага Брэсцкай і Свіслацкага Гродзенскай абласцей.

Даведнікі сведчаць, што тэрыторыя Белавежскай пушчы – трошкі менш за 153 тыс. гектараў. Аднак генеральны дырэктар Нацыянальнага парку Мікалай Бамбіза, якому, безумоўна, лепш вядома, за які ўчастак зямлі ён адказвае, называе іншую лічбу – 167 тыс. гектараў. Акрамя таго, вакол парку створана спецыяльная буферная ахоўная зона плошчай больш за 80 тыс. гектараў.

Для лепшай аховы і больш рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў Нацыянальнага парку яго тэрыторыя сёння падзяляецца на чатыры функцыянальныя зоны. Найбольш строгі рэжым абсалютнай запаведнасці, дзе забаронена любая дзейнасць, акрамя навуковай, маюць каля 20 % тэрыторыі Белавежскай пушчы. А 5235 гектараў гэтай зоны наогул абвешчаны Сусветнай прыроднай спадчынай чалавецтва. Прыблізна трэцяя частка парку – зона рэгулюемага выкарыстання, яшчэ на трэці дазволена весці гаспадарчую дзейнасць, калі яна не будзе перашкаджаць захаванню асабліва ахоўных прыродных комплексаў. Нарэшце, 5 % пушчы – тэрыторыя для турыстаў. Сёння рыхтуюцца дакументы, якія дадуць магчымасць перагледзець замацаваныя межы. Тады да 70–80 тыс. гектараў павялічыцца зона абсалютнай запаведнасці, стане большай плошча лесу, аднесенага да Сусветнай спадчыны.

Заўважым, што на польскім баку, паводле ўсё тых жа даведнікаў, знаходзіцца 52 тыс. гектараў пушчы. Але, як слушна заўважае Мікалай Бамбіза, нацыянальным паркам у Польшчы сёння абвешчана толькі 10 тыс. гектараў лесу. Што гэта азначае на практыцы? Як вобразна распавёў мне адзін пушчанскі суразмоўца, які не ад-

нойчы бываў «на тым баку», у палякаў «ці не пад кожнай елкай то рэстаранчык, то гасцініца, то крама якая-небудзь, – не запаведнік, а гарадскі парк быццам». Палякі, быў час, нават кпілі з беларускіх пушчанцаў – маўляў, які да вас турыст паедзе, калі яму нават перакусіць няма дзе.

Аднак на беларускім баку за некалькі апошніх гадоў ужо створана досыць прыстойная турыстычная інфраструктура. Пабудаваны гасцініцы, да юбілею поўнасцю адноўлены рэстаранны комплекс. Сёння ў пушчы могуць адначасова заначаваць амаль 250 чалавек, а кафэ і рэстараны, адкрытыя ў Нацыянальным парку, могуць разам накарміць прыблізна такую ж колькасць наведвальнікаў. Дзеля цікавасці я зазірнуў у два атэльчыкі, размешчаныя на цэнтральнай сядзібе гаспадаркі, – утульна, чыста, па-сучаснаму. І нават адносна нядорага. А ў хуткім часе ў Камянюках адкрыецца яшчэ адна гасцініца. Як паабяцаў Мікалай Бамбіза, яна будзе зарыентавана ў першую чаргу на маладзёжную публіку. «Каб дзеткі, якія прыязджаюць да нас адкуль-небудзь з-пад Верхнядзвінска, не ехалі стомленыя тут жа дадому, а спакойна змаглі пераначаваць. Навошта ж амаль суткі ў аўтобусе трэсціся!» – гаворыць генеральны дырэктар парку.

Больш таго, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка пад час юбілейных мерапрыемстваў аб'явіў, што на захаванне і стварэнне інфраструктуры запаведных тэрыторый Беларусі з 1 студзеня 2010 года дзяржава будзе накіроўваць 5 % сродкаў фонду аховы прыроды. Значыць, фінансавыя магчымасці запаведнікаў пашырацца. А яшчэ Прэзідэнт у Камянюках даў даручэнне прадоўжыць актыўную дзейнасць па развіцці ў парку турыстычнай інфраструктуры. Па перыметры Белавежскай пушчы неўзабаве будзе пабудавана добраўпарадкаваная аўтамабільная дарога працягласцю амаль 250 кіламетраў. Уздоўж пушчанскіх межаў і абапал гэтай дарогі будзе створана своеасаблівае турыстычнае кальцо з гасцініцамі, рэстаранамі, крамамі – з любымі аб'ектамі адпачынку і забаў, на якія толькі хопіць фантазіі інвестараў.



Паляўнічы домік у пушчы

Толькі адзінае патрабаванне з боку дзяржавы да турыстычнай галіны застанецца нязменным: каб ніводная шыпулька не ўпала ў запаведным лесе па віне чалавека. Рух аўтамабіляў у пушчы, і без таго строга абмежаваны, будзе поўнасцю забаронены. Веласіпед, конь, лыжаролеры – калі ласка! Пешшу – ідзі сабе па сцежках, разам з экскурсаводам, куды хочаш! Для старых альбо нямоглых з'явяцца электрамабілі. А вось машыну, калі ласка, пакінь на санітарным кардоне – запаведнік павінен быць некранутым. Каб апошні еўрапейскі лес заставаўся лесам эталонным.

Як вынік такіх адносін да аховы прыроды – сігналы, што ідуць з польскага боку. Там з беларусаў больш не кпяць. Наадварот, уважліва прыглядаюцца да нашага вопыту. Справа ў тым, что Еўрапейскі саюз, паводле інфармацыі Мікалая Бамбізы, запатрабаваў ад Польшчы абвясціць нацыянальным паркам усю польскую тэрыторыю Белавежы, а не толькі згаданыя 10 тыс. гектараў. Значыць, давядзецца нашым суседзям і рэстараны з-пад кожнай елкі прыбраць, і гаспадарчую дзейнасць абмежаваць. «Мадэль для польскага боку – схема, укаранёная ў беларускай частцы пушчы», – не без гонару паведаміў Мікалай Бамбіза.

Зрэшты, і нам спатрэбіцца чужы вопыт. Хоць і прыязджаюць у пушчу штогод амаль 300 тыс. наведвальнікаў, кіраўніцтва Нацыянальнага парку не хавае сваіх спадзяванняў завабіць сюды яшчэ больш турыстаў, у тым ліку і замежных. Дзеля гэтага вывучаецца вопыт Германіі, Чэхіі, Польшчы. А з польскім Міністэрствам аховы навакольнага асяроддзя нават ёсць



У Белавежскай пушчы знаходзіцца рэзідэнцыя беларускага Дзеда Мароза

дамоўленасць наконт таго, што нашы суседзі будуць спрыяць прытоку замежных экскурсантаў у беларускую частку пушчы праз спрошчаны пагранічны пераход, які створаны і дзейнічае ў запаведніку. З цягам часу Белавежа будзе ператворана ў адзіны трансгранічны турыстычны аб'ект, у чым у роўнай ступені зацікаўлены як беларускі, так і польскі бакі.

Па праўдзе кажучы, дык грандыёзным планам, намаляваным апошнім часам па развіцці Белавежскай пушчы, пачынаеш верыць. Прынамсі, як толькі прыязджаеш у сталіцу Белавежы – пасёлак Камянюкі. Пры падрыхтоўцы да юбілею для супрацоўнікаў запаведніка тут было пабудавана 35 новых дамоў, а сам пасёлак поўнасцю рэканструяваны. Сёння гэта ўжо не тыя Камянюкі, якія я бачыў два гады таму пад час прыезду ў пушчу. І нават пушча сёння ўжо не тая – новы музей, новая канферэнц-зала, новыя вальеры для жывёл... Будзе, будзе Белавежа турыстычнай Мекай!

– Пройдзе час, і мы цалкам ацэнім тое, што зроблена за апошнія гады ў Белавежскай пушчы, – упэўнены намеснік кіраўніка справамі Прэзідэнта Аляксандр Раманоўскі. – Але галоўнае, што і пасля юбілейных мерапрыемстваў работы па развіцці пушчы, па ўдасканаленні інфраструктуры не спыняцца.

ЖЫВАЯ ПРЫРОДА

І ўсё ж... І гасцініцы, і басейны, і рэстараны, і забаўляльныя комплексы – усё гэта, безумоўна, добра. Без іх прывабіць спакушанага сучаснай цывілізацыяй турыста немагчыма. Але ж, тым не менш, зусім не за камфортным начлегам і смачнай вячэрай прыязджае ў Белавежскую пушчу чалавек.

Пушча – гэта сапраўднае дзіва, цуд і казка зямлі беларускай.

ЮНЕСКА ўключыла Белавежскую пушчу ў спіс Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ў 1992 годзе. У 1993 годзе запаведная зона Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» трапіла ў спіс біясферных запаведнікаў у рамках праграмы «Чалавек і біясфера». У 1997 годзе запаведнік быў узнагароджаны Дыпломам Савета Еўропы як адна з эталонных прыродаахоўных устаноў Старога Свету. А ў 1998 годзе Белавежская пушча атрымала статус ключавой арніталагічнай тэрыторыі сусветнага значэння.

Не выпадкова гэта ўсё. Бо пушча – лес незвычайны.

Тут, на самым захадзе Беларусі, самая кароткая зіма – яна доўжыцца не больш за 100 дзён, а ў іншы год паспявае скончыцца і за тры месяцы. А значыць, расліны маюць самы доўгі на тэрыторыі нашай краіны вегетацыйны перыяд. Больш таго, Нацыянальны парк размешчаны якраз на перасячэнні дзвюх геабатанічных зон – Еўрапейскай шыракалістай і Еўразіяцкай хвойналясной. Гэтым і тлумачыцца выключная разнастайнасць раслін, якія сустракаюцца ў Нацыянальным парку. Граб, скальны і чырвоны дуб, вяз – шурпаты і гладкі... Экскурсаводы пакажуць бярозу, на гонкім ствале якой утварыўся агромністы нарост у выглядзе галавы зубра. Або двухсотгадовыя елкі, вершаліны якіх пагойдваюцца на вышыні больш як 40 метраў.

Зімой, калі трапіць у пушчу па снезе, асабліва эфектна выглядае вечназялёны плюшч – адзіная еўрапейская ліяна, што расце ў Беларусі. Кажуць, аднойчы члены дэлегацыі з Італіі, якім паказвалі гэтае дзіва, спачатку хмыкнулі: маўляў, што тут такога, у нас такіх плюшчоў хоць гаць гаці! А потым, даўмеўшыся, на якой шыраце знаходзіцца іхняя Італія, а дзе Беларусь, ацанілі, завохкалі ад здзіўлення.

Пакажуць экскурсаводы і возера Лядскае, утворанае на нізкім балоце. Неглыбокае, не больш як тры метры. Затое рыбы ў ім!

Прадэманструюць цэлыя плантацыі елак, знішчаных караедам-тыпографам. З 2001 года ў пушчы вядзецца бязлітасная барацьба з гэтым ненажэрным шкоднікам. Але ж хімію ў запаведным лесе выкарыстоўваць нельга, таму, як адзначыў генеральны дырэктар парку Мікалай Бамбіза, на сённяшні дзень ёсць адзіны метад змагання з жучком – спілоўванне і знішчэнне пашкоджаных дрэваў.

Між іншым, на месцы загінуўшых дрэваў тут жа пачынаюць расці маладзенькія парасткі. А імі надта ж любяць паласавацца шматлікія капытныя, якія жывуць у лесе. Таму не здзіўляйцеся, калі раптам натрапіце на цэлыя ўчасткі, агароджаныя сеткай. Гэта не вас ад жывёл абараняюць, а лес! Пушчанцы расказваюць, што некалькі гадоў таму рабілі загарадкі з жэрдак, каб не дапусціць знішчэнне маладых дрэўцаў. Дык вось, зубры, як высветлілася, аказаліся надзвычай законапаслухмянымі: калі нельга далей, дык і не палезем. Затое казулі... Супрацоўнікі парку заўважылі, як казулі, не маючы спруту і росту, каб пераскочыць загарадку, навучыліся... перавальвацца праз яе, бокам куляючыся праз жэрдкі! Давялося гарадзіць лес сеткай.

А потым, за чарговым паваротам сцежкі, проста на вас выйдзе сямейка зуброў... Ох і відовішча! Хоць і кажуць, што Мікола Гусоўскі ў сваёй знакамітай «Песні пра зубра» апісаў вымерлага сёння еўрапейскага тура, а не зубра (гэта ў тура паміж рагоў можна было пасадзіць трох чалавек), усё роўна страшнавата. І верыш, што зубры спакойныя і нават палахлівыя – адзін чалавек можа цэлы статак пагнаць, – але побач з імі неяк трошкі не па сабе. Дарослы самец зубра важыць у сярэднім 830 кілаграмаў, вышыня ў карку – 180 сантыметраў. І калі ведаць, што гэтая аграмадзіна можа разагнацца да 40 кіламетраў у гадзіну, а пры жаданні з лёгкасцю пераскочыць двухметровую агароджу, грудзінай ламаючы верхнія жэрдкі, становіцца зусім вусцішна. А зубр тым часам, бы знарок, зірне на цябе сваім цёмным вокам з доўгімі вейкамі, рыкне нешта паціху... Божа ж ты мой, лепш хутчэй круціць педалі і прэч ад сапраўднага гаспадара Белавежы!

І яшчэ. Не забывайце прывозіць у пушчу дзяцей! Не толькі звяроў паглядзець і лес паслухаць. Як вядома, тут, у самай пушчанскай глыбіні, з 2003 года па ініцыятыве Аляксандра Лукашэнкі месціцца рэзідэнцыя нашага беларускага Дзеда Мароза. Я нават не буду распісваць, колькі шчасця і захаплення ў дзіцячых вачах ад сустрэчы з казачнымі героямі тут, у сапраўдным лесе, а не на сцэне школьнага тэатра. Гэта, думаю, і так зразумела. Адзначу лепш, што нават дарасламу тут ёсць на што паглядзець, ёсць чаму здзівіцца.



Праз стагоддзе ў Белавежскую пушчу вярнулася лань еўрапейская

***

Адзін з навуковых супрацоўнікаў Нацыянальнага парку распавядаў мне, што расліны Белавежы ўмеюць выпрацоўваць нейкае хімічнае рэчыва, якое надта ж спрыяльна ўздзейнічае на чалавечы арганізм. Менавіта таму тут так лёгка дыхаецца. І таму тут, у пушчы, адлятаюць некуды цяжкія думкі, а настрой становіцца добрым і ўзнёслым. На жаль, як называецца тое рэчыва, я не запомніў, – відаць, пад яго ўздзеяннем не ўся інфармацыя была ўжо здольная маёй галавой засвойвацца! Але я таму супрацоўніку паверыў. Пушча – жывы і разумны арганізм. А калі так, то ў нейронах гэтага лесу могуць утварацца эндарфіны. Ці, як іх іншы раз называюць, гармоны радасці. Яны проста лунаюць у паветры Белавежы. Нам жа застаецца толькі прыехаць сюды, удыхнуць і пераканацца: шчасце ёсць!

Максім ГІЛЕВІЧ ■